Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

DOI:10.17951/sb.2017.11.337
Studia Białorutenistyczne 11/2017

Альгерд Бахарэвіч, *Бэзавы і чорны. Парыж праз акуляры беларускай літаратуры,* Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2016, 278 с.

Ёсць кнігі, напісаныя непрафесійнымі літаратуразнаўцамі (пісьменнікамі, журналістамі, краязнаўцамі), якія прафесійныя даследчыкі літаратуры не могуць абмінуць увагай. У расійскай культурнай прасторы такімі кнігамі з'яўляюцца, напрыклад, зборнік эсэ Пятра Вайля і Аляксандра Геніса *Родная речь. Уроки изящной словесности* (Нью-Йорк 1989 – Масква 2011) альбо зборнік нарысаў Дзмітрыя Быкава *Советская литература. Расширенный курс* (Масква 2015). У беларускай культурнай прасторы ролю папулярызатара і, адначасова, крытыка-рэвізіяніста айчыннага пісьменства ўзяў на сябе колішні паэт-бумбамлітавец, а сёння вядомы празаік Альгерд Бахарэвіч. Ягоная кніга *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча* (Мінск 2012) выклікала зацятую дыскусію ў літаратурных колах, многія літаратуразнаўцы і пісьменнікі ўспрынялі яе як абразу беларускай літаратуры, як замах на аўтарытэт класікаў (у першую чаргу на класікаў беларускай *савецкай* літаратуры). Пасля публікацыі *Гамбурскага рахунку…* (а насамрэч, яшчэ раней: пасля аўтарскага агучвання асобных раздзелаў кнігі у перадачах "Радыё Свабодная Еўропа") за Бахарэвічам замацаваўся імідж найвялікшага ворага беларускай літаратуры, які нянавісць да беларушчыны ўзвёў у ранг аўтарскай стратэгіі на шляху да поспеху.

Мне ўжо даводзілася пісаць пра *Гамбурскі рахунак Бахарэвіча (*Kawalou, 2013, s. 294–300); у адрозненні ад многіх калег-літаратуразнаўцаў я ацэньваю гэту кнігу станоўча: нягледзячы на суб'ектыўнасць ацэнак і дыскусійнасць асобных высноў, *Гамбурскі рахунак…* прываблівае свежым, арыгінальным поглядам на беларускую літаратуру, адметным стылем выкладу матэрыялу, а цікавых думак і трапных назіранняў у кнізе Бахарэвіча куды больш, чым у некаторых навуковых дысертацыях і грувасткіх манаграфіях. Як гэта ні парадаксальна, Бахарэвіч-эсэіст мне нават больш цікавы, чым Бахарэвіч-празаік, ягоныя *Гамбурскі рахунак…* і *Малая медычная энцыкляпедыя Бахарэвіча* мяне больш інтрыгуюць, чым ягоныя аповесці і раманы з сенсацыйнымі назвамі накшталт *Ніякай літасьці Валянціне Г., Сарока на шыбеніцы* ці *Белая муха, забойца мужчын*.

Новая кніга Бахарэвіч-эсэіста мае назву *Бэзавы і чорны. Парыж праз акуляры беларускай літаратуры***.** Як сведчыць назва, кніга таксама прысвечана беларускай літаратуры, альбо, як пераконвае яе змест, *і беларускай літаратуры таксама*. Калі б гэтая рэцэнзія мусіла мець загаловак, можна было б назваць яе так: *Парыж. Літаратура. Бахарэвіч*. Як і ў *Гамбурскім рахунку…,* Бахарэвіча ў кнізе шмат – злога, вольнага, закаханага, – і тым, каго цікавіць толькі *Парыж*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

ці толькі *Літаратура,* а асоба аўтара выклікае антыпатыю, лепш не разгортваць *Бэзавы і чорны…*.

Адметны жанр кнігі аўтар спрабуе вытлумачыць чытачу ў невялікай прадмове-прысвячэнні, напрыканцы кнігі ёсць традыцыйная выдавецкая анатацыя, але найбольш адэкватна канцэпцыю зборніка адлюстроўвае невялікі фрагмент з эсэ *Шпага. Менск. Імперыя,* змешчаны таксама на задняй старонцы вокладкі:

> Кожны пісьменьнік піша пра Парыж, нават калі нічога пра яго ня ведае і нават тады, калі апісвае сваю родную вёску. <…> Няма нічога весялейшага і рызыкоўнейшага, як блуканні з мапай Парыжу па беларускай літаратуры і яе ваколіцах, па сваіх і чужых жыццях і словах, бяз сэнсу і мэты, як і належыць эўрапейцам, паэтам і марнатраўцам (Bacharewicz, 2016, s. 13).

Такім чынам, чытачу прапануюцца *блуканні*, *вандроўка*, *шпацыр*: як запэўнівае аўтар – па ваколіцах беларускай літаратуры з мапай Парыжу (але ў такім разе, *Бэзавы і чорны…*быў бы усяго толькі працягам, чарговай варыяцыяй *Гамбурскага рахунку…),* а як сведчыць рэальны змест кнігі – усё ж такі па Парыжу, з цытатамі не толькі з беларускай, але і з сусветнай літаратуры (Гейнэ, Кафка, Джойс,Набокаў), з аўтарскімі комплексамі і амбіцыямі, з разважаннямі пра засцянкова-калгасны патрыятызм і залатую нэндзу эміграцыі, з думкамі пра мужычкоў і эстэтаў у літаратуры, поруч з каханай Julie і ў рэфлексійнай самоце, з добрымі сябрамі і выпадковымі мінакамі-парыжанамі, з жывымі людзьмі і прывідамі на могілках Пэр-Ляшэз, з радасным усведамленнем таго, што нарэшце пішацца кніга, у якой *можна ўсё*…

Вандроўка ўслед за аўтарам па кожным з гэтых маршрутаў заняла б напэўна столькі ж месяцаў, колькі давялося Бахарэвічу пражыць у Парыжы, каб напісаць сваю дзіўную кнігу. Паколькі гэтая рэцэнзія прызначана для навуковага выдання і мае абмежаваны аб’ём, пройдземся тым маршрутам, які нас цікавіць найбольш: Парыж у беларускай літаратуры.

Напэўна, яшчэ гадоў дваццаць таму само вызначэнне тэмы – *Парыж праз акуляры беларускай літаратуры* – успрымалася б як правакацыйнае і крыху піжонскае, так як некалі ўспрымалася назва цудоўнага эсэ Леаніда Дранько-Майсюка *Стомленасць Парыжам* (1994): маўляў, усе мараць пра тое, каб пабываць у Парыжы, а няўдзячны паэт *пабываў* і *стаміўся*. Але напачатку XXI ст. пасля з’яўлення шматлікіх вершаў, падарожных нататак, эсэ пра Парыж Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Арлова, Адама Глобуса, Андрэя Хадановіча і, асабліва, пасля публікацыі кнігі Валянціна Акудовіча *Разбурыць Парыж* (2004) сама па сабе тэма новай кнігі Альгерда Бахарэвіча ўжо не здзіўляе.

Сёння беларуская літаратура можа пахваліцца не толькі творамі, у якіх Парыж традыцыйна выступае як недасяжная мара, увасабленне ідэальнай, найбольш гарманічнай з мастацкага пункту гледжання прасторы для жыцця творцы, як сімвал жаночай і мастацкай прыгажосці, культуры і цывілізаванасці ўвогуле, але і шэра-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

гам тэкстаў, у якіх сцвярджаецца анталагічная роўнасць паміж вершамі Рыльке і песнямі палескай бабулькі, сусветнавядомымі нацюрмортамі Маціса і "цікеткамі" нязнаных давыд-гарадоцкіх мастакоў, у якіх свядома разбураецца міф Парыжа як мастацкага цэнтра Сусвету і недасяжнага ўзору для наследавання.

Паэт Леанід Дранько-Майсюк у эсэ *Стомленасць Парыжам*, вандруючы па парыжскіх вулках і скверах услед за Гіёмам Апалінэрам, па-майстэрску ўплёў беларускія ўспаміны і асацыяцыі ў габелен французскіх уражанняў і прыйшоў да аптымістычнай высновы, што:

> <…> калі мы сапраўды адстаём ад сваіх суседзяў на сто, дзвесце ці нават на больш гадоў, калі мы часта прыстаём, стамляемся, басанож адольваючы дадзены гістарычны шлях, то адставанне нашае (я ўпэўнены!) вельмі блізкае да той відавочнай розніцы, якая некалі існавала паміж пакутнай хадою босых галілейскіх рыбакоў і зладжаным крокам абутых рымскіх легіянераў (Drańko-Majsiuk, 1994, s. 115–116).

Філосаф Валянцін Акудовіч у эсэ *Разбурыць Парыж*, узяўшы ў якасці эпіграфа выказванне Дранько-Майсюка, а ў якасці інтэлектуальнага ўзбраення – працы Дэрыды, Льётара, Барта, Дэлёза, упэўнена абвясціў: „ <…> усім занураным у панысласць беларусам што ў нас няма альтэрнатывы: альбо мы разбурым Парыж, альбо Парыж сваім цяжкім ценем разбурыць нас – дашчэнту" (Akudowicz, 2004, s. 132). Парыж разумеўся як Сталіца вялікага еўрапейскага наратыву, як глабальны Сімулякр, што засланіў нашыя вочы ад белага свету, як сімвал лагацэнтрычнага мыслення, у катэгорыях якога Беларусь нязменна выглядала як незавершаны праект, краіна-аўтсайдэр, інтэлектуальная і культурная правінцыя. На думку Акудовіча, збаўцам беларусаў з-пад інтэлектуальнага прыгнёту Вялікага еўрапейскага напратыву, станецца Постмадэрн, прыход якога ў "родныя балоты" беларускі філосаф горача вітаў (Akudowicz, 2004, s. 120–140).

На жаль, эсэ Леаніда Дранько-Майсюка ў кнізе Альгерда Бахарэвіча не згадваецца, а вось Валянціну Акудовічу прысвечаны асобны раздзел: *Акудовіч. Балота. Дыскурс.* Як хроснага бацьку "Бум-бам-літу", сімпатычнага чалавека і арыгінальнага філосафа, Бахарэвіч Акудовіча шануе і нават велікадушна дазваляе яму разбураць імперскую сталіцу культуры: "Парыж – дзіўнае месца. Калі яго зьнішчаеш – у зусім іншым кутку Эўропы робіцца сьвятлей. Але і самому Парыжу горш не робіцца. Яго бурыш дашчэнту – ён застаецца, у яго тысяча сьмерцяў, і кожная зь іх – мастацтва" (Bacharewicz, 2016, s. 229).

Але канатацыі вобразу Парыжу ў кнізе Бахарэвіча зусім іншыя, чым у акудовічаўскім эсэ. Для Бахарэвіча Парыж – сімвал творчай свабоды, магічнае месца, дзе можна быць "…чужымі і вольнымі ў самым цэнтры Сталіцы сьвету" (Bacharewicz, 2016, s. 89), "Парыж – тэст на іншадумства, на вольнасць і проста на іншасць" (Bacharewicz, 2016, s. 90), гэта лакмусавая паперка, якая вызначае ступень незалежнасці творцы ад нацыянальнай традыцыі, засцянковага патрыятызму, дзяржаўнай ідэалогіі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

На думку Бахарэвіча, пісьменнік-эстэт і алкаголік-нонканфарміст Міхась Стральцоў, які ніколі не быў у Парыжы, мае да гэтага горада большае дачыненне, чым дзесяткі ягоных калег па пісьменніцкаму цэху, якія наведалі сталіцу Францыі ў складзе розных савецкіх дэлегацый: "…адабраныя ў выніку д'ябальскай селекцыі, радасныя, як рабы, адзначаныя гаспадаром за верную службу, прыніжаныя дарослыя людзі, у якіх забралі годнасьць, пакінуўшы літаркі, кубікі, тэмкі: складай правільна, і будзеш цэлы" (Bacharewicz, 2016, s. 62).

Шмат хто з беларускіх беларускіх пісьменнікаў пабываў у Францыі ў савецкія часы: Якуб Колас, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі, Міхась Чарот, Максім Танк, Пімен Панчанка, Янка Брыль, Васіль Быкаў, Вячаслаў Адамчык і інш., а Ўсевалад Краўчанка нават скончыў жыццё самагубствам у Ніцы. Але Бахарэвіч лічыць (і цяжка з ім не пагадзіцца), што Максім Багдановіч:

> …увайшоў у гісторыю як самы французскі і самы парыскі беларускі паэта. Хоць пабываць у сталіцы сьвету яму так і не давялося. Але некаторыя яго вершы дзіўным чынам пасуюць Парыжу – быццам ён тут іх і напісаў. <…> Багдановіч мог чытаць французаў у арыгінале – і адно гэта ставіць яго вышэй за літаратурных мужычкоў-баравічкоў: з вышыні замежнай мовы ён бачыў больш і далей, чым ягоныя старэйшыя таварышы. Што ж, гэта закон Загібелькі: у Парыж зазвычай трапляюць ня тыя, хто можа яго зразумець і ацаніць (Bacharewicz, 2016, s. 65).

Загібелька – гэта назва вёскі ў эпіграме Кандрата Крапівы з нагоды паездкі Якуба Коласа ў Парыж ў 1935 годзе ў складзе савецкай дэлегацыі на Кангрэс пісьменнікаў у абарону культуры. З'едлівае чатырохрадкоўе Крапівы – адзін з самых вядомых твораў беларускай літаратуры пра Парыж: "Быў я ў Парыжы на кангрэсе, / То ў Загібельцы, браце, лепш – / Грыбоў няма ў Булёнскім лесе, / А ў Сэне хоць бы адзін лешч" (Bacharewicz, 2016, s. 64). Як працяг крапівоўскай эпіграмы і пацвярджэнне выказанай там ідэі можна разглядаць адказ Якуба Коласа: "Калі агледзіш хвайнякі / І гэты кут пазнаеш бліжай, / Зьбіраючы баравікі, / Дык вывад я зраблю такі: / Мне Загібелька лепш Парыжа" (Bacharewicz, 2016, s. 64).

Катэгарычнае сцвярджэнне "мне Загібелька лепш Парыжа" у розных варыяцыях праходзіць лейтматывам праз усе творы беларускай літаратуры савецкага перыяду, прысвечаныя Парыжу, а сваё універсальнае, планетарнае гучанне набыла ў вядомых радках Генадзя Бураўкіна: "Я не ганю землі чужыя, – Хай іх сонца не абміне, / Толькі дзе б за морам не жыў я, Беларусь мая сьнілася мне" (Bacharewicz, 2016, s. 168).

Часам, клятвы паэтаў у вернасці Радзіме гучаць камічна, як, напрыклад, у вершы Анатоля Зэкава: "Мяне Парыж як сына прыме – / Куды падзенецца і стома? / А я сумую па Радзіме, / А я шкадую, што ня дома" (Bacharewicz, 2016, s. 131). Альгерд Бахарэвіч разглядае падобныя тэксты ў раздзеле *Не хацім. Ня любім. Не паедзем.* Кампліменты ў адрас беларускіх савецкіх пісьменнікаў сустракаюцца ў кнізе Бахарэвіча вельмі рэдка, найчасцей аўтар кпіць з іх твораў, прысвечаных

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

“сталіцы свету”. І многія творы, якія цытуюцца ў кнізе *Бэзавы і чорны…,* гэтага заслугоўваюць. Як можна не іранізаваць з радкоў Лявона Неўдаха: “А ў Парыжы ў Сэне – вада! / Ля вады той гуляе Жанэта. / Ды Парыж мне чужы. Не шкада, / Што ня стрэўся з жанчынаю гэтай” (Bacharewicz, 2016, s. 170) І Бахарэвіч іранізуе: “У Парыжы ў Сэне вада – гэта, вядома, неверагоднае адкрыццё. Я наўмысна схадзіў падзівіцца. Сапраўды, вада ў Сэне ёсць, плёскаецца паціху, бура-зеленаватая, бурклівая, сцюдзёная. Хто б мог падумаць, га?” (Bacharewicz, 2016, s.170).

Каментуючы радкі Пімена Панчанкі з *Патрыятычнай песні* (“Я ездзіў ад Манмартра да Вэрсаля, / Глядзеў, марнеў, зусім нядужым стаў./ Каб з Рэнуарам зноў пабыць у зале, / Я Мулен-руж старанна абмінаў…” (Bacharewicz, 2016, s. 123)), Бахарэвіч адзначае: “Чуецца ў радках Панчанкі нейкае клятвеннае апраўданне і ў той самы час гідкае падмірґванне мужычка на службе: не падумайце, старанна абмінаў, за кілямэтр абыходзіў. Белоруссо поэто, обліко морале” (Bacharewicz, 2016, s. 123).

Тым не менш, вынесены ў загаловак кнігі Бахарэвіча эпітэт “бэзавы і чорны” паходзіць менавіта з паэмы *Патрыятычная песня* (1959), дзе сярод іншых гарадоў свету, якія наведаў Пімен Панчанка, апісваецца і Парыж: “Раскінуўся ты, бэзавы і чорны, / Падпёршы вежай сіні небасхіл, / Спрадвеку трапяткі і непакорны,/ І стомлены, і поўны вельмі свежых сіл” (Bacharewicz, 2016, s. 121). Каментуючы гэтыя радкі, Бахарэвіч аб’ектыўна прызнае: “Трэба сказаць, файныя колеры выбраў для яго [Парыжа – С.К.] Панчанка, дакладныя” (Bacharewicz, 2016, s. 121).

Пазітыўна ацэньвае Альгерд Бахарэвіч вершы з парыжскімі матывамі ў творчасці Рыгора Барадуліна, прысвяціўшы ім асобны раздзел з “падазронай” назвай *Барадулін. Пахмельле. Трава*. Аўтар *Бэзавага і чорнага…* з прыемным здзіўленнем адзначае:

> Амаль унікальны выпадак: Парыж не замінае Барадуліну любіць радзіму. Паміж Ушачай і Парыжам ён намацвае тонкую, але дужа трывучую нітку, што злучае Сталіцу сьвету і беларускую вёску. У ніткі ёсьць назва – Эўропа, і Барадулін кажа пра гэта: нясьмела, але ўголас. Гэта тая нітка, якую будуць спрабаваць парваць усе, з абодвух бакоў. А яна ніяк ня рвецца – быццам і ня нітка, а тоўстая карабельная ліна (Bacharewicz, 2016, s. 176).

Яшчэ больш высока ацэньвае Бахарэвіч тэксты пра Парыж (і іх творчасць увогуле) сваіх сучаснікаў: Адама Глобуса, Валянціна Акудовіча, Андрэя Хадановіча, Вальжыны Морт. Напачатку XXI стагоддзя гэтыя аўтары шмат зрабілі для ўмацавання той ніткі, якая завязалася паміж Парыжам і Беларуссю, сусветнай і беларусскай літаратурай стагоддзем раней намаганнямі Максіма Багдановіча і ягоных паслядоўнікаў. Аналізуючы эсэ Адама Глобуса *Празрысты Парыж* (2001), Бахарэвіч з павагай хоць і не без іроніі падкрэслівае:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

> Гэта вялікі, злосны і прыгожы тэкст.
> І празрысты. Калі абмінаць усе сэксуальныя памкненьні аўтара, што часам апаноўваюць яго ў самых нечаканых месцах, калі ветліва не рэагаваць на іх і ісьці далей, пакідаючы аўтара зь імі сам-насам і даганяючы на наступнай вуліцы – можна прайсьці зь ім скрозь увесь горад і пабачыць самае Галоўнае. Эсэ Глобуса – найлепшы антыгід па Парыжы ў беларускай літаратуры (Bacharewicz, 2016, s. 223).

Можна, вядома, абвінаваціць Бахарэвіча ў суб'ектыўнасці ацэнак (усе чатыры аўтары, згаданыя вышэй, з'яўляюцца ягонымі сябрамі альбо прыяцелямі і прысвечаныя ім раздзелы ў кнізе чытаюцца як творчыя партрэты), але, сапраўды, актыўнае эстэтычнае асваенне геаграфічнай прасторы пачалося ў беларускай літаратуры напрыканцы XX – пачатку XXI стагоддзяў і звязана з творчасцю сяброў суполак "Тутэйшыя", "ТВЛ", "Бум-Бам-Літ":

> Вершаваныя, празаічныя, драматургічныя тэксты густа пересыпаны геаграфічнымі найменнямі: Мінск, Полацк, Вільня; Беларусь, Літва; Венецыя, Падуя, Рым, Прага, Варшава, Лазана, Вітэнберг; Грэцыя, Германія, Швейцарыя, Індыя, Кітай, Японія; Усход і Захад; Еўропа.
>
> Пытанне «Хто я?» у большасці тэкстаў відазмяняецца ў пытанне «Дзе я?» (адказы даюцца самыя розныя, напрыклад: «тут» ці «за небакраем Эўропы»).
>
> Высвятленне ўласнага месцазнаходжання не толькі ў часе (гісторыі), але і ў сусвеце, эстэтычнае засваенне геаграфічнае прасторы, пошукі «сапраўднага дому» для Беларусі паміж Усходам і Захадам робяцца першаснай патрэбай «новае літаратуры», і геаграфія ператвараецца ў філасофію (Kawalou, 1991, s. 7).

Можна нават упікнуць Альгерда Бахарэвіча за тое, што не ўсе творы сучаснай беларускай літаратуры, важныя для раскрыцця тэмы, ён разгледзіў у сваёй кнізе. Акрамя эсэ Леаніда Дранько-Майсюка *Стомленасць Парыжам,* я назваў бы яшчэ вершы Алеся Аркуша, Юрыя Гумянюка, і, канечне, раман Артура Клінава *Шалом*, галоўны герой якога Андрэйка/Андрэ выразна пазіцыяніруецца як франкафіл. З'едлівым водгукам на распрацоўку тэмы Парыжа ў айчыннай літаратуры, гучыць у рамане Клінава рэпліка Андрэ пра паэта і мастака Буяна, які стварае батальнае палатно пра тое, як: "мандавошкі выпраўляюцца захапіць Парыж" (Klinau, 2011, s. 92). Ідэя палатна нагадвае жартаўлівую фантасмагорыю з эсэ Валянціна Акудовіча *Разбурыць Парыж* пра калону трактароў "Беларусь", якая рухаецца "да Парыжа, каб засадзіць Елісейскія Палі беларускай бульбай" (Akudowicz, 2004, s. 133).

Да недахопаў кнігі *Бэзавы і чорны. Парыж праз акуляры беларускай літаратуры* можна залічыць сумніўную інтэрпрэтацыю *Ідыліі* Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча як *дурнаватага вадэвільчыка,* у якім: "злосны і няшчасны аўтар спра-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

буе прыкрыць сваю незапатрабаванасць, сваю крыўду на Парыж і зайздрасць да тых, хто з'ехаў або напісаў нешта вартае" (Bacharewicz, 2016, s. 23). Не любіць Альгерд Бахарэвіч Дуніна-Марцінкевіча, яшчэ ў *Гамбурскім рахунку…* аўтар іранізаваў наконт таго, што: "…пінскай местачковай шляхце хацелася выпіць і пабіцца, а менскай навуковай шляхце хочацца займець свайго шэксьпіра, хай і ў такі дзіўны спосаб" (Bacharewicz, 2012, s. 22–23). Але калі ў камічнай франкаманіі слугі Жана з *Ідылііі* бачыць трагедыю чалавека, па волі лёсу пазбаўленага еўрапейскай культуры і свабоды, то падобным чынам можна інтэрпрэтаваць і вобраз лакея Яшы з *Вішнёвага саду* Чэхава, а самога Антона Паўлавіча з ягонай настальгіяй па "сыходзячай" Расіі залічыць у лагер засцянковых патрыётаў і ворагаў еўрапейскай культуры[1].

Самая ж галоўная загана "парыжскай" кнігі Бахарэвіча – цікавай, наватарскай, шчыра-асабістай – з літаратуразнаўчага пункту гледжання бачыцца ў яе агістарызме, у імкненні аўтара ацэньваць ўчынкі і творы беларускіх пісьменнікаў XIX-XX ст. з пазіцый сённяшняга дня. Напэўна, Альгерду Бахарэвічу добра вядома, што большасць вершаў і нарысаў пра замежжа пісалася беларускімі савецкімі пісьменнікамі як ідэалагічная справаздача, "творчая" адпрацоўка доўгачаканай камандзіроўкі ў капіталістычны свет. Канечне, кожны апублікаваны тэкст можна аналізаваць і крытыкаваць, але які ў гэтым сэнс, калі шчырасці і мастацкасці ў падобных творах няма *a priori*? Напэўна, Альгерд Бахарэвіч цудоўна разумее, чаму Уладзімір Караткевіч у сваіх вершах руйнаваў парыжскую Бастылію, а не мінскі Пішчалаўскі замак, аднак публічна здзіўляецца таму, што:

> Караткевіч, седзячы ў "турме народаў" займаецца любімай справай: спрабуе выказаць боль сьвету, як ён яго разумее. Ён самы гуманны гуманіст і прастадушны душапастыр беларускай савецкай літаратуры: яму падаецца, што ўвесь боль там, за мурамі (Bacharewicz, 2016, s. 31).

Нашаму пакаленню проста пашанцавала. Мы не мусім карыстацца выключна "эзопавай мовай", можам выбіраць паміж радзімай і эміграцыяй, можам хоць заўтра выбрацца ў Парыж. Уладзімір Караткевіч ніколі не быў у Парыжы, як і многія іншыя беларускія пісьменнікі.

Адзін з самых пранізлівых эпізодаў у гісторыі ўзаемадачыненняў Парыжа і беларускай літаратуры, які апісваецца ў кнізе *Бэзавы і чорны…*, гэта ўспамін Віктара Карамазава пра Міхася Стральцова. Карамазаў едзе на канферэнцыю ЮНЭСКА ў Парыж, адабраны партыйным кіраўніцтвам ў выніку той самай "д'ябальскай селекцыі". "Неблаганадзейны" Стральцоў ноччу, у цягніку "Масква-Парыж" перадае свайму больш рэспектабельнаму сябру таямнічы скрутачак з просьбай завезці ў Парыж. На вакзале ў Парыжы Карамазаў разгортвае скрутачак, знаход-

[1] Сімптаматычна, што спектакль Аляксея Ляляўскага паводле Вішнёвага саду ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек называўся *З Парыжам скончана!*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 08:23:50

зіць там драбок калійнай солі і запіску: "Хай гэты драбочак скамянела-салёнага поту нашай беларускай зямелькі будзе табе ў Парыжы салодкім напамінкам усяго роднага. Люблю Парыж. Міх. Стральцоў" (Bacharewicz, 2016, s. 155).

Закаханы ў французскую літаратуру Міхась Стральцоў ніколі не быў у Парыжы. Але драбок калійнай солі, перададзены ім з сябрам у Парыж, гаворыць мне больш пра стаўленне беларускіх пісьменнікаў да Сталіцы Свету, чым дзесяткі твораў, разгледжаных у кнізе *Бэзавы і чорны*…

Сяргей Кавалёў

Bibliografia

Źródła

Akudowicz, Walancin. (2004). *Razburyć Paryż,* Miensk: Łohwinau.

Bacharewicz, Alhierd. (2016). *Bezawy i czorny. Paryż praz akulary biełaruskaj litaratury*, Minsk: Wydawiec Zmicier Kołas.

Bacharewicz, Alhierd. (2012). *Hamburski rachunak Bacharewicza*, Minsk: Radyjo Swaboda – Łohwinau.

Drańko-Majsiuk, Leanid. (1994). *Akropal*, Minsk: Mastackaja Litaratura.

Klinau, Artur. (2011). *Szałom. Wajenny raman*, Minsk: Мінск: Łohwinau.

Opracowania

Kawalou, Siarhiej. (2013). Hamburski rachunak Alhierda Bacharewicza. *Studia Białorutenistyczne,* 7, s. 294–300.

Kawalou, Siarhiej. (1991). Nowaja eurapieizacyja. *Biełaruś,* 7, s. 7.